тивной деятельности и применять различные методы проведения занятий в годичном цикле профессионального обучения.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. *Муллер, А. Б.* Физическая культура: учебник и практикум для СПО / А. Б. Муллер, Н. С. Дядичкина, Ю. А. Богащенко. — Люберцы: Юрайт, 2016. — 424 с.
2. *Решетников, Н. В.* Физическая культура: учебник / Н. В. Решетников [и др.]. — М.: ИЦ Академия, 2013. — 176 с.
3. *Холодов, Ж. К.* Теория и методика физического воспитания и спорта: учеб. пособие / Ж. К. Холодов, В. С. Кузнецов. — 2-е изд., испр. и доп. — М.: Академия, 2012. — 480 с.

**УДК 811.161.3'37:[61:378]**

# ПРЫНЦЫПЫ ПАДБОРУ МАТЭРЫЯЛУ ПРЫ СКЛАДАННІ ТЭСТАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ВЫШЭЙШЫХ МЕДЫЦЫНСКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

***Карніеўская Т. А.***

**Установа адукацыі**
**Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

У сучасным адукацыйным працэсе тэсты як від праверкі і карэкцыі ведаў адыгрываюць значную ролю. Прычым тычыцца гэта ўсіх узроўняў навучання, пачынаючы ад школы і заканчваючы вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і ўстановамі перападрыхтоўкі кадраў. Такое становішча склалася дзякуючы ў першую чаргу аптымальным часавым суадносінам як пры выкананні заданняў (тэсты дазваляюць за кароткі час праверыць веды даволі вялікай колькасці навучэнцаў), так і пры падвядзенні і атрыманні вынікаў: ад некалькіх хвілін (камп'ютарныя тэсты) да некалькіх дзён (цэнтралізаванае і рэпетыцыйнае тэсціраванне). Да таго ж тэставыя заданні даволі лёгка вар'іруюцца і карэкціруюцца ў залежнасці ад патрабаванняў навучальнага працэсу.

***Мэта***

Вызначэнне асноўных прынцыпаў складання тэставых заданняў для тэматычнага і выніковага кантролю ведаў па курсе "Беларуская мова: прафесійная лексіка", прызначаным для студэнтаў першага курса медыцынскіх ВНУ (у прыватнасці, для студэнтаў УА "ГомДМУ").

***Метады:*** апісальны, параўнальны.

Адным з асноўных прынцыпаў падбору дыдактычнага матэрыялам з'яўляецца неад'емная сувязь тэставых заданняў з прафесійнымі ведамі, г.зн. з медыцынскай тэрміналогіяй. Найбольш яскрава гэты прынцып праяўляецца пры праходжанні такіх тэм курса, як "Лексіка. Сістэмныя сувязі ў медыцынскай тэрміналогіі", "Лексіка. Мнагазначнасць у медыцынскай лексіцы", а таксама пры выкананні студэнтамі выніковага камп'ютарнага тэста перад заліковымі заняткамі. Сярод заданняў, у якім рэалізуецца разглядаемы прынцып, можам адначыць наступныя: ***1.*** *Вызначце, як называюцца сістэмныя лексічныя сувязі тыпу "скрыты" — "латэнтны": паронімы, амонімы, антонімы, <u>сінонімы</u>*, мнагазначныя.* ***2.*** *Знайдзіце сінонім да слова "лазарэт": <u>шпіталь</u>*, здраўніца, санаторый, курорт, паліклініка.* Заданні такога тыпу замацоўваюць матэрыял вучэбна-метадычнага дапаможніка, які выкарыстоўваецца ў якасці асноўнага падручніка на занятках па беларускай мове ў ГомДМУ [3].

Трэба таксама адзначыць, што ў сучасным грамадстве сярод патрабаванняў да маладога спецыяліста адзначаецца наяўнасць даволі высокага ўзроўню валодання

дзяржаўнымі мовамі краіны пражывання ці навучання, прычым як у вуснай, так і ў пісьмовай форме. У нашай краіне гэтае патрабаванне набыло асаблівую актуальнасць пасля прыняцця ў 2010 годзе новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі [4]. З гэтай мэтай у тэставых заданнях па беларускай мове намі ўведзена значная колькасць пытанняў па асаблівасцях беларускага правапісу, асабліва пры праходжанні тэм “Фанетычныя асаблівасці беларускай мовы”, “Правапіс вялікай літары”, а ў выніковым камп’ютарным тэсце пытанні такога тыпу складаюць больш за палову ўсіх заданняў, прычым часцей за ўсё з выкарыстаннем медыцынскай лексікі. Так, для прыкладу можна адзначыць наступныя пытанні: ***1.*** *Адзначце слова, у якім на месцы пропуску трэба ўставіць літару* ***а****: бранхі_льны, рэ_кцыя*, ды_гназ, мі_кард, полі_міэліт.* ***2.*** *Адзначце слова, у якім у беларускай мове адбываецца пераход* ***д*** *у* ***дз****: дезинфекция, кардиолог, ремантадин*, дерматит, радиология.* ***3.*** *Адзначце, у якім слове ў беларускай мове пішуцца падоўжаныя зычныя: грипп, компресс, тонзиллит, аппетит, белладонна*.* ***4.*** *Знайдзіце няправільна напісанае слова: скаліёз, амнезія, бактэрыцыдны, гепатыт, панкрэаціт*.* ***5.*** *Знайдзіце правільна напісанае слова: ортапед, стоматолаг, фтызіатр, пульманолаг*, іммунолаг.* Пры падрыхтоўцы адпаведных заданняў намі выкарыстоўваюцца акадэмічныя выданні-слоўнікі, у прыватнасці “Беларускі арфаграфічны слоўнік”, выдадзены НАН Беларусі [1], і “Русско-белорусский медицинский словарь” [2].

У сувязі з тым, што ўніверсітэцкая адукацыя накіравана ў першую чаргу на падрыхтоўку рознабакова адукаванага спецыяліста, нельга абмінуць увагай і забеспячэнне студэнтаў ведамі па агульных моваэнаўчых пытаннях. У прыватнасці, сюды адносяцца такія лінгвістычныя элементы, як паняцце мовы і маўлення, класіфікацыя славянскіх моў, нормы літаратурнай мовы, стылістыка беларуськвй мовы і інш. На занятках па адпаведных тэмах намі прапаноўваюцца спецыяльныя тэставыя заданні, сярод якіх наступныя: ***1.*** *Маўленне — гэта: выкарыстанне моўных адзінак у працэсе зносін*; сукупнасць адзінак (гукаў, слоў, сказаў і інш.) і правіл іх ужывання; пісьмовая форма мовы; тэрытарыяльна абмежаваная разнавіднасць мовы; мова аднаго ці некалькіх населеных пунктаў, якая мае спецыфічныя рысы.* ***2.*** *Адзначце паўднёваславянскія мовы: польская, чэшская, славацкая; балгарская, сербахарвацкая, украінская; балгарская, сербахарвацкая, македонская*; балгарская, чэшская, македонская; польская, македонская, славацкая.* ***3.*** *Лексічныя нормы патрабуюць: правільнага напісання слоў, правільнага выбару слова і дарэчнасці яго прымянення*, правільнага вымаўлення, правільнай пабудовы словазлучэнняў і сказаў, правільнай пастаноўкі знакаў прыпынку.* ***4.*** *Адзначце, які стыль рэалізуецца ў дакладах, манаграфіях, рэфератах: мастацкі, публіцыстычны, навуковы*, афіцыйна-дзелавы, гутарковы.* ***5.*** *Адзначце, што з пералічанага з'яўляецца асаблівасцю афіцыйна-дзелавога стылю: канцылярскія штампы*, рытарычныя пытанні, ацэначная лексіка, памяншальна-ласкальныя суфіксы, навуковыя тэрміны*.

Немалая ўвага, на наш погляд, павінна надавацца і вывучэнню граматычных асаблівасцей беларускай мовы, у прыватнасці, сюды адносяцца такія тэмы, як правапіс канчаткаў назоўнікаў мужчынскага роду ў родным склоне (*адзначце, які з наступных назоўнікаў у родным склоне адзіночнага ліку мае канчатак* ***-а****: адрэналін, тэтрацыклін, ціск, тэрапеўт*, стаматыт*), несупадзенне роду адпаведных назоўнікаў у беларускай і рускай мовах (*адзначце назоўнік, у якога пры перадачы ў сістэму беларускай мовы зменіцца род: окись*, белладонна, амнезия, полиомиелит, йод* або *знайдзіце назоўнік, які ў беларускай мове будзе мець форму жаночага роду: лицо, затылок*, питание, корь, отравление*), спецыфіка пабудовы некаторых словазлучэнняў у беларускай мове (*адзначце, у якім словазлучэнні парушана сінтаксічная сувязь паміж лічэбнікам і назоўнікам: два сталы, шэсць дзясятых, дзесяць мілілітраў, тры аўтамабіля*, восем падручнікаў*) і г. д. Заўважна, што дадзены прынцып рэалізуецца пераважна на матэрыяле прафесійнай лексікі.

Репозиторий ГомГМУ

Яшчэ адным важным прынцыпам, на нашу думку, з’яўляецца неабходнасць пашырэння слоўнікавага запасу студэнтаў, прычым не толькі ў галіне медыцынскай тэрміналогіі, але і т. зв. лексікі агульнага ўжытку, бо нішто так не развівае мысленне, як працэс назапашвання новых лексічных адзінак з наступнай іх інтэрпрэтацыяй і актыўным ужываннем. Да таго ж, прымяненне ў тэстах заданняў на веданне значэнняў устойлівых спалучэнняў (фразеалагізмаў) мае пэўнае культуралагічны сэнс: ***1.*** *Адзначце тлумачэнне, якое адпавядае фразеалагізму* ***быць на сёмым небе****: уводзіць у зман, выхваляючыся сваімі здольнасцямі; гаварыць пустое; быць вельмі задаволеным*, шчаслівым; нечакана замоўкнуць; зусім не турбавацца, не звяртаць ніякай увагі.* ***2.*** *Адзначце тлумачэнне, якое адпавядае фразеалагізму* ***бібікі біць****: кланяцца каму-небудзь; марнаваць час, гультаяваць*; быць уважлівым; перамагчы каго-небудзь; рабіць вельмі хутка.*

Як ужо адзначалася, дадзеныя тэставыя заданні прызначаны для выкарыстання ў якасці праверачнага матэрыялу на практычных занятках, для правядзення выніковага тэста пасля вывучэння курса беларускай мовы, а таксама для падрыхтоўкі да камп’ютарнага тэсціравання пасля праходжання адпаведнай тэмы на занятках.

***Вывады***

Такім чынам, найбольш рацыянальнымі прынцыпамі складання тэставых заданняў на занятках па беларускай мове ў медыцынскіх ВНУ з’яўляюцца тыя, што не толькі спрыяюць рэалізацыі вузкіх лінгвістычных задач (уменне правільна пісаць і перакладаць тэрміны на беларускую мову), але і тыя, што дапамогуць праз рэалізацыю міжпрадметных сувязей і пашырэнне кругагляду стварыць найбольш аптымальныя ўмовы для фарміравання будучага спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, які б валодаў універсальнымі ведамі не толькі ў сваёй, але і ў іншых сферах чалавечага жыцця.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы : уклад.: Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя / пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск, 2010. — 695 с.
2. *Воронец, В. И.* Русско-белорусский медицинский словарь / В. И. Воронец. — Гродно: ГрГМУ, 2012. — 100 с.
3. *Карніеўская, Т. А.* Беларуская мова: вучэб.-метад. дапаможнік / Т. А. Карніеўская. — Гомель : ГомДМУ, 2014. — 56 с.
4. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — 4-е выд., стэр. — Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2012. — 152 с.


**УДК 796.012**

# ВЛИЯНИЕ ИНТЕРВАЛЬНОЙ ГИПОКСИЧЕСКОЙ ТРЕНИРОВКИ НА СКОРОСТЬ РЕАКЦИИ У БОКСЕРОВ

***Коваленко Ю. А., Николаева А. Г.***

**Учреждение образования**
**«Витебский государственный ордена**
**Дружбы народов медицинский университет»**
**г. Витебск, Республика Беларусь**

***Введение***

Поиск путей оптимизации построения подготовки спортсменов на современном этапе все более сводится к субъекту деятельности, а точнее к поиску таких тренировочных программ, которые позволяют учитывать индивидуальные особенности спортсменов и благодаря этому целенаправленно воздействовать на организм спортсмена, развивая его сильные и компенсируя слабые стороны.

В последние десятилетия широкое применение в спорте получил метод экспериментальной гипоксической тренировки, который предполагает использование гипобарической и (или) нормобарической гипоксии в прерывистом (интервальном) режиме.

Основной механизм адаптационного эффекта всех видов гипоксической тренировки обусловлен активизацией стресс-лимитирующих систем срочной адаптации и формированием структурного следа долговременной адаптации, направленных на компенсацию дефицита кислорода во вдыхаемом воздухе [1]. При этом происходит стимулирова-



Репозиторий ГомГМУ